Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Факультэт культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці
Кафедра педагогікі сацыякультурнай дзейнасці

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
_________Л.І.Казлоўская
“___”_____________20__

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
__________І.І.Каралёў
“___”___________20___

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# ТРАДЫЦЫЙНАЯ НАРОДНА-ПЕДАГАГІЧНАЯ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ

для спецыяльнасці
1-23 01 14 “Сацыяльна-культурная дзейнасць”

Складальнік:
Н.В.Сівіцкая, дацэнт кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці факультэта культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці БДУКМ, кандыдат філалагічных навук

Разгледжана і зацверджана
на пасяджэнні Савета ўніверсітэта 23.05.2017
пратакол № 9.

Мінск
БДУКМ
2017

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

УДК 811.161.1'243(075.8)
ББК 74.03(4Беи)+74.002.5]я73

Р э ц э н з э н т ы

*А.М.Сяргеева*, старшы навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Б, кандыдат філалагічных навук, дацэнт.
*І.У.Капцюг*, дацэнт УА “Ваенная акадэмія РБ”, кандыдат філалагічных навук, дацэнт.

**Сівіцкая Н.В.,**

дацэнт кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці
факультэта культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці БДУКІМ,
кандыдат філалагічных навук

У вучэбна-метадычным комплексе разглядаецца народна-педагагічная культура, яе роля ў грамадскай і сямейнай сістэме выхавання і навучання, нацыянальна арыентаванай педагагічнай дзейнасці сям’і і школы. Разгляд традыцыйнай народна-педагагічнай культуры Беларусі праводзіцца ў параўнальна-гістарычным аспекце, задзейнічаны шырокі славянскі і неславянскі кантэкст, што набывае асаблівую актуальнасць ва ўмовах поліэтнічнага грамадства і пранікнення тэндэнцый выкарыстання замежных выхаваўчых методык.

Выданне прыначана для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў, што атрымліваюць адукацыю па спецыяльнасці “сацыяльна-культурная дзейнасць”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ

**1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА ....................................................................4**

**2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ...........................................................................5**

2.1. Канспект лекцый.........................................................................................5

**3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ..........................................................................11**

3.1. Тэматыка практычных заняткаў.............................................................11

**4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ...............................................................13**

4.1. Пытанні да заліку.......................................................................................13

4.2. Пералік выкарыстоўваемых сродкаў дыягностыкі вынікаў......................16

навучальнай дзейнасці......................................................................................16

**5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ.........................................................................18**

ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ ...............................................................................28

ФОРМА КАНТРОЛЮ .........................................................................................35

СРОДКІ ДЫЯГНОСТЫКІ ВЫНІКАЎ НАВУЧАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ .........35

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Веданне народна-педагагічнай культуры з'яўляецца актуальным у кантэксце сацыялізацыі і фарміравання асобы кожнага канкрэтнага чалавека.

Народна-педагагічная культура адыгрывае значную ролю ў педагагічнай практыцы і жыцці грамадства наогул, яна неабходная для грамадскай і сямейнай сістэмы выхавання і навучання, нацыянальна арыентаванай педагагічнай дзейнасці сям'і і школы. Без апоры на аутэнтычную педагагічную традыцыю народа немагчымая эфектыўная дзейнасць сучаснай школы, сям'і і грамадства, паколькі этнапедагогіка забяспечвае пераемнасць педагагічнага вопыту. У сучасным грамадстве паспяховая практыка навучання і выхавання цесна звязана з узнаўленнем этнічнай культуры, паколькі падрастаючае пакаленне найбольш адэкватна і эфектыўна выхоўваецца ў полі сваёй традыцыйнай культуры, у полі педагагічных традыцый свайго народа.

Значнасць народна-педагагічных каштоўнасцей падкрэслена ў "Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Беларусі" – як адзін з фактараў захавання нацыянальнай самаідэнтычнасці і супрацьстаяння знешнім пагрозам.

У рамках прапанаванага спецкурса вывучэнне традыцыйнай народна-педагагічнай культуры будзе праводзіцца ў параўнальна-гістарычным аспекце. Будзе задзейнічаны шырокі славянскі і неславянскі кантэкст, што набывае асаблівую актуальнасць ва ўмовах поліэтнічнага грамадства і пранікнення тэндэнцый выкарыстання замежных выхаваўчых методык.

Спецкурс пабудаваны на грунтоўным факталагічным матэрыяле, значная частка якога была сабрана аўтарам падчас дыялекталагічных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

экспедыцый (з 1999 года па гэты час). Таксама выкарыстаны сучасныя распрацоўкі беларускіх вучоных-этнолагаў, што займаліся дадзенай праблемай.

**Мэта**: азнаямленне студэнтаў з тэарэтычным і практычным матэрыялам вывучаемага курса.

**Задачы**:

- азнаёміць студэнтаў з лекцыйным матэрыялам;
- вызначыць стратэгію падрыхтоўкі да практычных заняткаў;
- увесці ў карыстанне рэкамендуемую літаратуру;
- азнаёміць з сістэмай кантролю ведаў.

Вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны “Традыцыйная народна-педагагічная культура Беларусі” ўсяго прадугледжана 28 гадзін, з іх 28 – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відам заняткаў: 4 гадзіны – лекцыі; 24 гадзіны – практычныя.

Форма кантролю – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

### 2.1. Канспект лекцый

**Тэма 1. Этнапедагогіка, народна-педагагічная культура як сацыякультурны феномен і напрамак педагогікі**.

Тэрмін *этнапедагогіка* складаецца з двух слоў – *этнас* і *педагогіка*, якія і вызначаюць яго семантыку. Слова *этнас* (ад грэч. *ethnos* ‘народ, племя’) ужываецца ў народазнаўстве для абазначэння ўстойлівай супольнасці людзей, што склалася гістарычна на пэўнай тэрыторыі і характарызуецца агульнасцю мовы, побыту, культуры, рысаў псіхікі і самасвядомасці, адлюстраванай у адзінай назве і

ўяўленнях пра агульнасць паходжання. Слова *педагогіка* паходзіць ад грэч. *paidagogike* 'ваджэнне дзяцей'.

1)ЭП уяўляе сабой стыхійныя веды народа пра выхаванне і навучанне падрастаючага пакалення, набытыя ў працэсе гістарычнага развіцця этнасу, калектыўны педагагічны вопыт народа;

2)ЭП забяспечвае бесперарыўнасць і пераемнасць выхаваўчага ўздзеяння на асобу ад нараджэння дзіцяці да ўступлення асобы ў дарослы стан (у шлюб);

3)у ЭП ажыццяўляецца комплекснасць працоўнага, духоўна-этычнага, эмацыянальнага, разумовага і фізічнага развіцця дзіцяці.

**3.Асноўныя прынцыпы, сродкі, метады і прыёмы выхавання і навучання ў народнай педагогіцы беларусаў.**

У НП беларусаў у якасці вядучых вылучаюцца наступныя педагагічныя прынцыпы: абавязковая закончанасць педагагічнага намагання, скіраванасць да жыцця, прыродаадпаведнасць, прынцып дэманстрацыйнай антрапатэхнікі, гуманізму, пераемнасці ў выхаванні.

З моманту зараджэння ў НП беларусаў выпрацаваліся шматлікія **метады і прыёмы** выхавання і навучання.

Умоўна метады выхавання і навучання ў НП можна раздзяліць на тры групы: *1)метады дысцыплінавання; 2)заахвочвання; 3)пакарання*.

ЭП як навука выяўляе каштоўныя педагагічныя ідэі народнага выхавання і навучання, прыводзіць іх у сістэму, узаемадзейнічаючы з іншымі навуковымі дысцыплінамі, такімі як педагогіка, псіхалогія, этнаграфія або этналогія (гл. тэрмін *этнаграфія дзяцінства*), фальклярыстыка, гісторыя, сацыялогія, мастацтвазнаўства, этыка, філасофія, рэлігіязнаўства.

ЭП як навуковая дысцыпліна мае свой аб'ект, прадмет, крыніцы, задачы і метады даследавання. **Аб'ектам ЭП** з'яўляецца народная педагогіка як сістэма. **Прадмет ЭП** – зараджэнне выхаваўчай практыкі ў канкрэтнага этнаса, узнікненне выхаваўчых ідэй, іх фарміраванне,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

трансфармацыя і сучаснае існаванне. **Крыніцы ЭП** – працы этнографаў і фалькларыстаў, рэлігійная і мастацкая літаратура, успаміны, архіўныя звесткі, палявы этнаграфічны матэрыял.

**Асноўныя задачы ЭП к навукі:**

*1)Агульнатэарэтычныя задачы:* вывучэнне спецыфікі НП; даследаванне асаблівасцей фарміравання сістэмы НП, яе гістарычнага развіцця і сучаснага стану; выяўленне месца ЭП у жыцці народа і яе ролі ў развіцці педагагічнай культуры чалавецтва.

ЭП даследаванні заклікаены прывесці ў сістэму веды аб формах, метадах, практыцы НП, прааналізаваць суадносіны паміж ідэальным і рэальным у выхаваўчым працэсе, даць ацэнку станоўчага і адмоўнага ў народным выхаванні.

*2)Навукова-практычныя задачы*: на аснове вывучэння жывых педагагічных працэсаў у народным асяроддзі, ЭП выпрацоўвае сродкі ўздзеяння на гэтыя працэсы, а таксама садзейнічае прапагандзе, прымяненню найбольш каштоўнай педагагічнай спадчыны, яе засваенню і перапрацоўцы ў сучаснай практыцы выхавання і навучання.

Любая навука мае свае **метады даследавання**. У ЭП прымяняюцца педагагічныя і этналагічныя метады.

**Педагагічныя:**

1) метады эксперыментальнага вывучэння педагагічнага вопыту:

**гутарка** – метад даследавання, які прымяняецца з мэтай атрымання ці тлумачэння неабходнай інфармацыі. Праводзіцца па загаддзя распрацаванаму плану. **Інтэрв'ю** – разнавіднасць гутаркі. Праводзіцца па загаддзя падрыхтаваных пытаннях, якія знаходзяцца ў строгай паслядоўнасці. Адказы фіксуюцца. **Анкетаванне** – метад збору інфармацыі з дапамогай анкеты. Анкетуемыя адказваюць на пытанні ў пісьмовай форме. **Назіранне** – мэтанакіраванае ўспрыняцце пэўнай педагагічнай з'явы з мэтай атрымання ўяўлення пра яе, а таксама канкрэтнага матэрыялу. **Эксперымент** – спецыяльна арганізаваная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праверка пэўнай гіпотэзы, метада, прыёма работы для выяўлення іх эфектыўнасці. Па часе дзеяння выдзяляюць доўгачасовы і кароткачасовы эксперымент. Перавага ЭП эксперыменту заключаецца ў тым, што ён мае справу з абагульненнем велізарнай колькасці асобных актаў паводзін, накіраваных на дасягненне педагагічных вынікаў. Пры гэтым, паводзіны цэлага народа бяруцца ў часе, які вымяраецца ў вялікіх гістарычных маштабах, што канкрэтна праяўляецца ў высокім ўзроўні аб'ектыўнасці педагагічных вывадаў народаў, у іх пераканаўчасці і непарушнасці.

2) тэарэтычныя педагагічныя метады даследавання:

**аналітычныя** метады ўключаюць якасны і колькасны аналіз вывучаемых прадметаў і з'яў. **Абагульняючыя** – уключаюць разнастайныя віды сінтэза, выяўленне агульнага, пранікненне ў сутнасць педагагічных з'яў. **Праекціровачныя** метады ўключаюць у сябе распрацоўку гіпотэз, мадэляў і тэхналогій і праектаванне вынікаў. **Інтэрпрэтацыйныя** метады ўключаюць у сябе правядзенне параўнанняў, аналогій і тлумачэнняў сутнасці педагагічных з'яў і сабраных фактаў.

**Этналагічныя метады:**

**Метад палявых даследаванняў** прымяняецца для назапашвання фактычнага матэрыялу, грунтуецца на доўгатэрміновым знаходжанні даследчыка ў вывучаемым этнічным асяроддзі. **Метад вывучэння пісьмовых крыніц** прымяняецца для атрымання інфармацыі пра педагагічную культуру розных народаў з пісьмовых крыніц.

## Тэма 2. Праблемы дзяцінства, узроставыя і індывідуальныя асаблівасці сацыялізацыі асобы ў народнай педагогіцы.

У этналогіі вылучаюць 5 узроставых ступеняў жыццёвага цыклу чалавека: дзяцінства, падлеткавы перыяд, моладзевы ўзрост, дарослы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўзрост, перыяд старасці. Традыцыйная народная свядомасць вылучае, аднак, толькі 3 ступені жыццёвага цыклу чалавека: дзяцінства, дарослы стан, старасць. Да сацыяльнай агульнасці дзяцей традыцыйная народная свядомасць адносіць, такім чынам, уласна дзяцей, падлеткаў і моладзь. *Тэрмінам дзяцінства* ў народнай традыцыі абазначаецца жыццёвы цыкл чалавека ад нараджэння да паўналецця (уступлення ў шлюб).

У НП беларусаў перыяд дзяцінства падзяляецца на 5 узроставых ступеняў, якія адпавядаюць уяўленням народа пра асаблівасці біялагічнага і псіхафізічнага сталення чалавека:

*1)ранняе маленства*; *2)маленства;* *3)уласна дзяцінства*; *4)падлеткавы перыяд*; *5)перыяд юнацтва*.

*Ранняе маленства*, згодна з народнай традыцыяй, ахоплівае ўзроставы перыяд ад нараджэння да 2-3 гадоў (абмяжоўваецца часам, калі дзіця пачынала гаварыць, калі дзіця адымалі ад грудзей і да т.п.). Ранняе маленства, паводле народных уяўленняў, – благаславёная пара жыцця. Дзяцей гэтай узроставай групы называлі *анёлак*, *немаўля*, без адрозненняў полу. Яно лічылася святым, бязгрэшным, чыстым.

Сукупнасць народна-педагагічных метадаў і прыёмаў выхавання і навучання дзяцей у перыяд ранняга маленства можа быць азначана як *школа пеставання, або мацярынская школа*. Выхаваннем дзіцяці ў раннім маленстве займалася, як правіла, выключна маці. Актыўны ўдзел у педагагічным працэсе на гэтым этапе бацькі ў народным асяроддзі лічыўся дурным тонам.

*Перыяд маленства* – ад 2-3 да 6-8 гадоў. Дзіця ў гэты час звычайна называлі ўжо па-іншаму: *дзяцёнак, дзяціна, дзетка, дзіцянятка, дзіцё, рабёнак, малы.* А найбольш пашырана – *блазнюк, блазнота, блазнюкі*.

Адметнасці працэсу выхавання і навучання блазнюкоў: 1)у працэсе выхавання і навучання не было гендэрнага падыходу. 2)Дзяцей паступова пераставалі песціць. 3)У практыцы выхавання і навучання

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паступова пераходзілі да мэтанакіраванага педагагічнага ўздзеяння. 4)У маленстве дзяцей пачыналі прывучаць да працы.

*Перыяд уласна дзяцінства* -- ўзрост ад 6-8 да 12-14 гадоў. З гэтага ўзросту дзеці атрымлівалі іншую тэрміналагічную назву – *блазнаў* (хлопчык – *блазн,* дзяўчынка – *блазноўка, блазнотка*). Але былі ўжо і іншыя, адрозныя назвы: хлопчыкаў называлі *хлопец, хлапец, малец,* дзяўчынак – *дзяўчо, дзеўка, дзяўчына*.

Асаблівасці працэсу выхавання і навучання блазнаў: 1)у працэсе выхавання і навучання афармляецца гендэрны падыход. 2)Галоўным сродкам выхавання і навучання, сацыялізацыі асобы ў гэты перыяд пачынае выступаць дапаможная працоўная дзейнасць дзіцяці. 3)У сістэме НП час уласна дзяцінства атрымаў назву перыяду дапаможных работ, або пастухоўскага. *Падлеткавы перыяд* – ад 12-14 да 16-17 гадоў. Назвы: *падлетак*, *падростак*, *вырастак*, *падшпарак.* Асаблівасці выхавання: 1)падлеткі *практычна поўнасцю (ужо не дапаможна)* ўключаюцца ў адпаведныя віды працоўнай дзейнасці і прымаюць раўнапраўны актыўны ўдзел у гаспадарчым жыцці сям'і.

2)Пачынаецца мэтанакіраванае навучанне дзіцяці пэўнаму віду рамяства ці нейкаму спецыялізаванаму, адмысловаму працоўнаму навыку (напрыклад, плесці лапці, кошыкі і пад.). 3)Падлеткі набываюць права займацца самастойнай спецыялізаванай працай, ўдзельнічаць у адыходных промыслах – ісці на сплаў лесу, наймацца ў рыбалавецкія, паляўнічыя, рамесныя арцелі. 4)Значным фактарам выхавання і навучання у падлеткавым узросце пачынае выступаць асяроддзе аднагодкаў.

*Перыяд юнацтва* – ад 16-17 да 19-21 Назвы: *хлопец*, *малец*, *дзеўка*. Асаблівасці выхавання: 1)у педагагічных узаемаадносінах бацькоў, старэйшых і дзяцей усталёўвалася суб'ектна-суб'ектная парадыгма адносін. 2)Удзел дарослых у выхаванні і навучанні юнакоў зводзіцца, па сутнасці да карэкціроўкі паводзін. 3)Галоўным фактарам выхавання і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

навучання, галоўным аўтарытэтам для юнакоў становіцца само моладзевае асяроддзе. 4) Моладзь набывала права паўнапраўна адпачываць – наведваць вечарынкі, вячоркі, святы, кірмашы – з мэтай знайсці сабе пару для шлюбу.

# 3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 3.1. Тэматыка практычных заняткаў

**Тэма 2. Праблемы дзяцінства, узроставыя і індывідуальныя асаблівасці сацыялізацыі асобы ў народнай педагогіцы**.

Асвятляюцца народныя ўяўленні аб ролі, функцыях, асаблівасцях псіхафізічнага развіцця кожнай з узроставых груп дзяцей, выкарыстанне адпаведных спецыфічных выхаваўчых сродкаў, метадаў, прыёмаў.

### Тэма 3. Пачатковая сацыялізацыя асобы ў народнай педагогіцы беларусаў.

Разглядаецца комплекс педагагічных намаганняў, накіраваных на забеспячэнне сацыякультурнай паспяховасці чалавека ад яго зачацця да прыняцця ў род. Вызначаецца паняцце і этапы пачатковай сацыялізацыі асобы. Праводзіцца разгляд асаблівасцей сацыялізацыі дзяцяці на кожным этапе.

### Тэма 4. Сямейнае выхаванне і навучанне ў народна-педагагічнай культуры беларусаў

Разглядаецца роля сям'і ў працэсе сацыялізацыі асобы. Як у цяперашнім посттрадыцыйным грамадстве, так і ў ранейшыя часы ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

традыцыйным грамадстве, сям’я ёсць, па сутнасці, аснова сацыялізацыі асобы.

### Тэма 5. Праца як сродак выхавання і навучання ў этнапедагогіцы беларусаў

У ходзе вывучэння тэмы разглядаецца праца як гаспадарча-эканамічная і духоўна-этычная катэгорыя ў традыцыйным соцыуме, вывучаюцца віды працы і іх педагагічны змест.

### Тэма 6. Соцыум як фактар навучання і выхавання ў традыцыйным і сучасным грамадстве

Паняцце “грамадская традыцыя”, роля і месца грамадскай традыцыі ў традыцыйным грамадстве, асноўныя прынцыпы функцыянавання традыцыйнай сельскай грамады беларусаў і іх педагагічны змест.

### Тэма 7. Асноўныя каштоўнасныя арыенціры грамадскага выхавання ў народна- педагагічнай культуры беларусаў

Сямейныя каштоўнасці як сродак выхавання – асаблівасці заключэння шлюбу, функцыянавання сям’і, сямейна-маёмасных адносін. Рэлігійнасць і народная мараль як сродак фарміравання асобы – асаблівасці рэлігійнага выхавання асобы. Рэлігійнае выхаванне як адзін з аспектаў народна-педагагічнай культуры беларусаў.

### Тэма 8. Фальклор як комплексны сродак усебаковага навучання івыхавання асобы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Фальклор – комплексны сродак шматбаковага выхавання гарманічнай асобы. Жанры традыцыйнага фальклору .

### Тэма 9. Асаблівасці этнапедагагічнай камунікацыі ў полiэтнічным адукацыйным асяроддзі Беларусі

Акрэсліваюцца асаблівасці выкарыстання народнага педагагічнага інструментарыю ў сучасным поліэтнічным адукацыйным асяроддзі. Разглядаецца этнапедагогіка розных нацыянальных і саслоўна-класавых груп насельніцтва Беларусі.

**Пытанні**:

### Тэма 10. Культура этнапедагагічнай дзейнасці на сучасным этапе развіцця беларускага грамадства

Праводзіцца параўнальны аналіз педагагічнага працэсу ў традыцыйным і посттрадыцыйным грамадствах, акрэсліваюцца шляхі выкарыстання станоўчага вопыту народнай педагогікі ў сучасным педагагічным працэсе. Акрэсліваюцца асаблівасці вырашэння педагагічных і выхаваўчых задач з улікам поліэтнічнага складу сучаснага грамадства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ

### 4.1. Пытанні да заліку

1. Этнапедагогіка: змест паняцця. Роля этнапедагогікі ў педагагічнай практыцы і жыцці грамадства.

2. Сутнасныя адметнасці этнапедагогікі як сістэмы выхавання і навучання.
3. Асноўныя прынцыпы і сродкі выхавання і навучання ў сістэме этнапедагогікі беларусаў.
4. Сістэма метадаў і прыёмаў выхавання і навучання ў народнай педагогіцы беларусаў.
5. Асноўныя прыёмы метаду дысцыплінавання ў народнай педагогіцы беларусаў.
6. Асноўныя прыёмы метаду заахвочвання ў народнай педагогіцы беларусаў.
7. Асноўныя прыёмы метаду пакарання ў народнай педагогіцы беларусаў.
8. Этнапедагогіка як навука, сувязь з іншымі навукамі. Аб'ект і прадмет, крыніцы, задачы этнапедагогікі.
9. Перыядызацыя полаўзроставых ступеняў дзяцінства.
10. Асаблівасці развіцця і выхавання дзяцей, сацыялізацыі асобы ў раннім маленстве.
11. Асаблівасці развіцця і выхавання дзяцей, сацыялізацыі асобы ў перыяд маленства.
12. Асаблівасці развіцця і выхавання дзяцей, сацыялізацыі асобы ў перыяд уласна дзяцінства.
13. Асаблівасці развіцця і выхавання дзяцей, сацыялізацыі асобы ў падлеткавы перыяд.
14. Асаблівасці развіцця і выхавання дзяцей, сацыялізацыі асобы ў перыяд юнацтва.
15. Пачатковая сацыялізацыя асобы: паняцце. Асаблівасці сацыялізацыі дзіцяці ў перадродавы перыяд.
16. Асаблівасці сацыялізацыі дзіцяці ў перыяд родаў.
17. Асаблівасці сацыялізацыі дзіцяці ў перыяд пасля нараджэння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

18. Радзіны, хрэсьбіны: іх месца ў сістэме поглядаў народа аб сацыялізацыі асобы.
19. Адносіны беларусаў да інстытутаў шлюбу і сям'і як фактараў выхавання і навучання.
20. Тыпы і структура традыцыйнай сям'і беларусаў.
21. Асноўныя функцыі сям'і ў традыцыйным і сучасным грамадствах.
22. Прынцыпы выхавання і навучання ў традыцыйнай сям'і беларусаў.
23. Праца як гаспадарча-эканамічная і духоўна-маральная катэгорыя ў традыцыйным соцыуме.
24. Віды працы ў традыцыйным соцыуме і іх этнапедагагічны патэнцыял.
25. Прынцыпы працоўнага выхавання і навучання ў народнай педагогіцы беларусаў.
26. Узроставая паступовасць авалодвання працоўнымі навыкамі ў сістэме этнапедагогікі.
27. Віды промыслаў і рамёстваў, распаўсюджаныя на Беларусі. Формы навучання промыслам і рамёствам.
28. Фальклор як комплексны сродак уздзеяння на асобу. Жанрававідавая структура беларускага фальклору. Асноўныя педагагічныя функцыі фальклору.
29. Дзіцячы фальклор у сістэме этнапедагогікі: узроставая стратыфікацыя, выхаваўчы патэнцыял розных жанраў.
30. Узроставая стратыфікацыя і выхаваўчыя магчымасці народнай казкі.
31. Легенды і паданні і іх этнапедагагічны змест.
32. Выхаваўчыя магчымасці народных былічак, вусных апавяданняў, анекдотаў, жартаў, прыкмет і павер'яў.
33. Выхаваўчы патэнцыял беларускіх народных прыказак і прымавак.
34. Выхаваўчыя функцыі беларускіх народных загадак, выслоўяў.
35. Народны тэатр і яго месца ў сістэме этнапедагогікі беларусаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

36.Калядны цыкл народнага календара беларусаў: выхаваўчы патэнцыял.
37.Веснавыя святы і абрады беларусаў і іх выхаваўчае ўздзеянне.
38.Выхаваўчыя магчымасці летніх свят і абрадаў.
39.Восеньскія святы і абрады і іх этнапедагагічны патэнцыял.
40.Дыдактычна-выхаваўчыя функцыі вясельных звычаяў і абрадаў беларусаў.
41.Прынцыпы функцыянавання традыцыйнай сельскай грамады і яе роля ў сістэме народнай педагогікі беларусаў.
42.Народныя формы ўзаемадапамогі і дабрачыннасці і іх этнапедагагічны патэнцыял.
43.Шляхі выкарыстання станоўчага вопыту народнай педагогікі ў сучасным педагагічным працэсе.
44.Параўнальны аналіз педагагічнага працэсу ў традыцыйным і посттрадыцыйным грамадствах.
45.Методыка выкарыстання станоўчага вопыту этнапедагогікі ў сістэме грамадскага выхавання і навучання.
46. Асноўныя кірункі працы сацыяльнага педагога з сем'ямі па трансляцыі этнапедагагічных ведаў.
47. Класіфікацыя этнасаў і асаблівасці сучаснай этнасферы.
48. Полікультурная кампетэнтнасць сучаснага педагога.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.2. Пералік выкарыстоўваемых сродкаў дыягностыкі вынікаў навучальнай дзейнасці

Для выяўлення ўзроўня вынікаў навучання студэнтаў могуць выкарыстоўвацца:

1. Адказы на пытанні падчас практычных заняткаў;
2. Дыскусіі па праблемных пытаннях;

3. Выступленне з дакладамі, рэфератамі, паведамленнямі, эсэ на практычных занятках на абраныя тэмы;

4. Падрыхтоўка мультымедыйных прэзентацый;

5. Эўрыстычная размова;

6. Праблемная лекцыя.

### 4.3. Рейтынгавая сістэма

| | **балы** | **колькасць** | **усяго** |
|---|---|---|---|
| **наведванне** | | | |
| Лекцыі | **2** | **2** | **4** |
| практычныя | **2** | **12** | **18** |
| **актыўнасць** | | | |
| адказ на практычных занятках | **4** | **5** | **20** |
| Рэферат | **8** | **1** | **8** |
| Даклад | **20** | **1** | **20** |
| паведамленне | **10** | **1** | **10** |
| Эсэ | **30** | **1** | **30** |
| | | | 110 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
культуры і мастацтваў"

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
_____________А.А. Корбут
«______»____________2016 г.
Рэгістрацыйны №УД-___/уч.

**ТРАДЫЦЫЙНАЯ НАРОДНА-ПЕДАГАГІЧНАЯ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 14 “Сацыяльна-культурная дзейнасць”*

2017

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вучэбная праграма складзена на аснове Адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыіАСВА 1-23 01 14-2013 і вучэбнага плана па спецыяльнасці 1-23 01 14 “Сацыяльна-культурная дзейнасць”, рэг. № Е23-1-16/13 вуч. ад 27.06.2013

**СКЛАДАЛЬНІК:**

*Н.В. Сівіцкая*, дацэнт кафедры педагогікі сацыяльна-культурнай дзейнасці ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат філалагічных навук.

**РЭЦЭНЗЕНТЫ**:

*А.М.Сяргеева*, старшы навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Б, кандыдат філалагічных навук, дацэнт.

*І.У.Капцюг*, дацэнт УА “Ваенная акадэмія РБ”, кандыдат філалагічных навук, дацэнт.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*Кафедрай* педагогікі сацыяльна-культурнай дзейнасці ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 10 ад 30 мая 2017 г.);

*Прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № ад );

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Этнапедагогіка – гэта галіна сучаснай педагагічнай навукі, якая мае міждысцыплінарны характар і будуецца на ўзаемадзеянні разнастайных гуманітарных навук: педагогікі, псіхалогіі, этналогіі, рэлігіязнаўства, сацыялогіі, культуралогі.

Значэнне народнай педагогікі асабліва ўзрастае ў поліэтнічным грамадстве, паколькі асновай выхавання і навучання ва ўмовах узаемадзеяння людзей розных нацыянальнасцей звычайна з’яўляецца педагагічная сістэма тытульнай нацыі. Такім чынам, работнік устаноў культуры, сацыяльны работнік павінен вывучаць педагагічны вопыт свайго і суседніх народаў для адэкватнага выстройвання рабочага працэсу з прадстаўнікамі гэтых народаў. Дадзеная вучэбная праграма мае **сувязь** з дысцыплінамі: «Этнаграфія, міфалогія і фальклор беларусаў», «Культуралогія», «Тэхналогія святочна-абрадавай дзейнасці».

**Мэта**: тэарэтычная і практычная падрыхтоўка студэнтаў да рашэння задач прафесійнага і асабістага развіцця, фарміраванне педагагічнай кампетэтнасці.

**Задачы**:

- правесці параўнальны аналіз некаторых асаблівасцей беларускай і замежных сістэм выхавання, падкрэсліць прыярытэтнасць аутэтнычнай традыцыі;
- выявіць месца і ролю народнай педагогікі ў сучасным выхаваўчым працэсе;
- выхаваць здольнасці да крэатыўнага і крытычнага мыслення ў прафесійнай дзейнасці;
- сфарміраваць асноўныя навыкі выкарыстання народна-педагагічнай спадчыны ў практычнай дзейнасці;
- сфарміраваць уменне адаптаваць этычныя, эстэтычныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каштоўнасць да сучаснай сацыякультурнай сітуацыі.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнты павінны **ведаць:**

- асноўныя тэарэтычныя палажэнні народнай педагогікі;
- ролю сямейнага, грамадскага, працоўнага і рэлігійнага выхавання ў сацыялізацыі асобы;
- месца і ролю народна-педагагічнай культуры ў выхаваўчым і навучальным працэсе на сучасным этапе;
- асаблівасці сакральных табу, народнага дыскурсу, канфесіянальнай эстэтыкі і г.д.);

Студэнты павінны **ўмець**:

- выяўляць выхаваўчы патэнцыял беларускай абрадавай і па-за абрадавай культуры;
- выкарыстоўваць станоўчы вопыт народнай педагогікі ў педагагічнай і сацыякультурнай дзейнасці;
- быць здольнымі да талерантнага ўзаемадзеяння ў полікультурным грамадстве.

У выніку вывучэня дысцыпліны “Традыцыйная народна-педагагічная культура Беларусі” студэнты павінны набыць наступныя **кампетэнцыі**:

АК-4 Умець працаваць самастойна; АК-8 Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі; САК-6 Умець працаваць у камандзе; ПК-3 Рэалізоўваць агульнадзяржаўныя, рэгіянальныя і ведамасныя праграмы ў галіне культуры і мастацтваў; ПК-7 Арганізоўваць інфармацыйна-асветніцкую работу па месцы жыхарства; ПК-11 Выяўляць інтарэсы і педагагічныя патрэбы неасельніцтва ў розных відах адпачынкавай дзейнасці.

Форма атрымання вышэйшай адукацыі – дзённая і завочная.

Вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны *“Традыцыйная народна-педагагічная культура Беларусі”* ўсяго прадугледжана 64

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гадзіны, з іх 34 – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відам заняткаў: 34 гадзіны – практычныя.

Форма кантролю – залік.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛА

### Тэма 1. Уводзіны. Этнапедагогіка, народна-педагагічная культура як сацыякультурны феномен і напрамак педагогікі

Вывучаецца змест паняцця “этнапедагогіка”, месца і роля этнапедагогікі ў педагагічнай практыцы і жыцці грамадства, асаблівасці этнапедагогікі як педагагічнай сістэмы. Акрэсліваюцца мэты, задачы, змест этнапедагогікі як навукі і вучэбнага прадмета, яе аб’ект і прадмет, асноўныя прынцыпы, сродкі, метады і прыёмы выхавання і навучання. Адзначаецца сувязь народных педагагічных традыцый з этнічным развіццём беларусаў, традыцыйным укладам жыцця і народнай філасофіяй.

### Тэма 2. Праблемы дзяцінства, узроставыя і індывідуальныя асаблівасці сацыялізацыі асобы ў народнай педагогіцы

Даецца вызначэнне тэрміна *дзяцінства* паводле народнай традыцыі, адзначаецца перыядызацыя полаўзроставых ступеняў дзяцінства. Характарызуюцца асаблівасці развіцця, выхавання, сацыялізацыі асобы ў раннім маленстве, у перыяд маленства, у перыяд уласна дзяцінства, у падлеткавы перыяд, у перыяд юнацтва. Вызначаюцца асаблівасці выхавання, навучання, сацыялізацыі кожнай біяўзроставай групы – рэгламентацыя паводзін, адносін з боку бацькоў і грамады, асаблівасці назваў дзяцей кожнай групы, адметнасці ў знешнім выглядзе.

### Тэма 3. Пачатковая сацыялізацыя асобы ў народнай педагогіцы этнасаў Беларусі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вызначаецца паняцце і этапы пачатковай сацыялізацыі асобы. Праводзіцца разгляд асаблівасцей сацыялізацыі дзяцяці на кожным этапе -- у перадродавы перыяд, у перыяд, у перыяд пасля нараджэння. Разглядаюцца асаблівасці магічна- і сакральна-рытуальнай сацыялізацыі асобы. Адзначаецца месца радзін і хрэсьбін у сістэме поглядаў народа аб сацыялізацыі асобы, асаблівасці магічна-рытуальнай сацыялізацыі асобы.

**Тэма 4. Сямейнае навучанне і выхаванне ў народна-педагагічнай культуры Беларусі**

Разглядаецца роля сям'і ў працэсе сацыялізацыі асобы, крытэрыі сям'і як фактару выхавання і навучання ў народнай педагогіцы беларусаў (засанаванасць на шлюбе, аднанацыянальнасць і аднаканфесійнасць сужонкаў, дзетнасць і г.д.), тыпы і структура традыцыйнай сям'і беларусаў (нераздзеленая, малая), асноўныя функцыі сям'і ў традыцыйным грамадстве (рэпрадукцыйная, выхавальная, гаспадарча-эканамічная, рэкрэацыйная), прынцыпы і традыцыі сямейнага выхавання і навучання беларусаў.

**Тэма 5. Праца як сродак выхавання і навучання ў этнапедагогіцы народаў Беларусі**

Разглядаецца праца як гаспадарча-эканамічная і духоўна-этычная катэгорыя ў традыцыйным социуме, вывучаюцца віды працы і іх педагагічны змест, асноўныя прынцыпы працоўнага выхавання і навучання ў педагогіцы народаў Беларусі, характарызуецца гендэрнае раздзяленне працоўнага выхавання і навучання ў народна-педагагаічнай культуры этнасаў Беларусі, узроставая паступовасць авалодвання працоўнымі навыкамі, а таксама віды промыслаў і рамёстваў, распаўсюджаныя на Беларусі і формы навучання промыслам і рамёствам у сельскім і гарадскім асяроддзях.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тэма 6. Соцыум як фактар навучання і выхавання ў традыцыйным і сучасным грамадстве**

Вызначацца паняцце “грамадская традыцыя”, роля і месца грамадскай традыцыі ў традыцыйным і сучасным грамадстве, асноўныя прынцыпы функцыянавання традыцыйнай сельскай грамады беларусаў і іх педагагічны змест. Праводзіцца разгляд гуманныя грамадскія звычаі ўзаемадапамогі і дабрачыннасці (*талака, бонда, сябрына*) і іх педагагічны змест, уплыўустойлівых грамадскіх традыцый на правільную сацыялізацыю асобы, засваеннеасобай разнастайных сацыяльных роляў, а таксама наўсведамленне свайго месца ў адлажанай сістэме грамадскіх і сакральных сувязяў.

**Тэма 7. Асноўныя каштоўнасныя арыенціры грамадскага выхавання ў народнай педагогіцы этнасаў Беларусі**

Вывучаецца калектыўны характар каляндарных і сямейных свят і абрадаў, іх роля ў міжпакаленнай трансмісіі звычаяў, традыцый, этыкету, ідэалогі пэўнага грамадства. Вывучаецца рэлігійнае выхаванне як адзін з аспектаў народнай педагогікі і яго на фарміраванне, сацыялізацыю асобы, трывалых маральна-этычных арыенціраў, норм паводзін чалавека ў сям’і і грамадстве.

**Тэма 8. Фальклор як комплексны сродак усебаковага навучання і выхавання асобы**

Разглядаецца фальклор як комплексны сродак шматбаковага выхавання гарманічнай асобы, звяртаецца ўвага на абагульнены гістарычны, працоўны, сацыяльны і маральна-этычны, педагагічны вопыт народа ў розных фальклорных формах і жанрах. Роля казак у выхаванні асобы, комплекснае ўдзеянне фальклорных твораў у працэсе выхавання і навучання чалавека. Праводзіцца параўнальны аналіз

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фальклорных твораў розных этнасаў Беларусі і іх педагагічны патэнцыял.

**Тэма 9. Асаблівасці этнапедагагічнай камунікацыі ў поліэтнічным адукацыйным асяроддзі Беларусі**

Праводзіцца разгляд поліэтнічнай структуры беларускага грамадства як аб'ектыўнай рэальнасці, што мае глыбокія гістарычныя карані. Вывучаюцца фактары, якія іграюць дыферэнцыруючую (раз'ядноўваючую) ролю ў поліэтнічным асяроддзі. Разглядаюцца асаблівасці вырашэння педагагічных і выхаваўчых задач з улікам поліэтнічнага складу навучэнцаў.

**Тэма 10. Культура этнапедагагічнай дзейнасці на сучасным этапе развіцця беларускага грамадства**

Праводзіцца параўнальны аналіз педагагічнага працэсу ў традыцыйным і посттрадыцыйным грамадствах, разглядаюцца шляхі выкарыстання станоўчага вопыту народнай педагогікі ў сучасным педагагічным працэсе, методыка выкарыстання станоўчага вопыту народнай педагогікі ў сістэме грамадскага выхавання і навучання, асноўныя кірункі працы ў галіне сацыяльна-культурнай дзейнасці з сем'ямі, асобамі і калектывамі па трансляцыі этнапедагагічных ведаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ “ТРАДЫЦЫЙНАЯ НАРОДНА-ПЕДАГАГІЧНАЯ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ”

| Нумарр раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Колькасць гадзін КСР | Форма контролю ведаў |
| 1 | Тэма 1. Уводзіны. Этнапедагогіка, народна-педагагічная культура як сацыякультурны феномен і напрамак педагогікі | | 2 | | |
| 2 | Тэма 2. Праблемы дзяцінства, узроставыя і індывідуальныя асаблівасці сацыялізацыі асобы ў народнай педагогіцы | | 4 | 2 | Дыскусія, падрыхтоўка прэзентацый |
| 3 | Тэма 3. Пачатковая сацыялізацыя асобы ў народнай педагогіцы этнасаў Беларусі | | 4 | | |
| 4 | Тэма 4. Сямейнае навучанне і выхаванне ў народна-педагагічнай культуры Беларусі | | 4 | | |
| 5 | Тэма 5. Праца як сродак выхавання і навучання ў этнапедагогіцы народаў Беларусі | | 2 | 2 | Адказы на пытанні |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 6 | Тэма 6. Соцыум як фактар навучання і выхавання ў традыцыйным і сучасным грамадстве | | 4 | | |
| 7 | Тэма 7. Асноўныя каштоўнасныя арыенціры грамадскага выхавання ў народнай педагогіцы этнасаў Беларусі | | 4 | | |
| 8 | Тэма 8. Фальклор як комплексны сродак усебаковага навучання і выхавання асобы | | 4 | | |
| 9 | Тэма 9. Асаблівасці этнапедагагічнай камунікацыі ў поліэтнічным адукацыйным асяроддзі Беларусі | | 4 | 2 | Дыскусія, адказы на пытанні |
| 10 | Тэма 10. Культура этнапедагагічнай дзейнасці на сучасным этапе развіцця беларускага грамадства | | 2 | | |
| | **УСЯГО** | | 34 | 6 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ “ТРАДЫЦЫЙНАЯ НАРОДНА-ПЕДАГАГІЧНАЯ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ”

*для студэнтаў завочнай формы навучання*

| | Раздзелы і тэмы | Колькасць аудыторных заняткаў | | |
|---|---|---|---|---|
| | | Усяго | Лекцыі | Практычныя заняткі |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Этнапедагогіка, народна-педагагічная культура як сацыякультурны феномен і напрамак педагогікі. | 2 | 2 | |
| 2 | Праблемы дзяцінства, узроставыя і індывідуальныя асаблівасці сацыялізацыі асобы ў народнай педагогіцы | 2 | 2 | |
| 3 | Пачатковая сацыялізацыя асобы ў народнай педагогіцы беларусаў | 2 | | 2 |
| 4 | Сямейнае выхаванне і навучанне ў народна-педагагічнай культуры беларусаў | 2 | | 2 |
| | **УСЯГО** | 8 | 4 | 4 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ

**Тэма 2. Праблемы дзяцінства, узроставыя і індывідуальныя асаблівасці сацыялізацыі асобы ў народнай педагогіцы**.

Асвятляюцца народныя ўяўленні аб ролі, функцыях, асаблівасцях псіхафізічнага развіцця кожнай з узроставых груп дзяцей, выкарыстанне адпаведных спецыфічных выхаваўчых сродкаў, метадаў, прыёмаў.

**Пытанні**:

1.Перыядызацыя полаўзроставых ступеняў дзяцінства.

2.Асаблівасці развіцця, выхавання, сацыялізацыі асобы ў раннім маленстве.

3.Асаблівасці выхавання і навучання, сацыялізацыі асобы ў перыяд маленства.

4.Асаблівасці выхавання і навучання, сацыялізацыі асобы ў перыяд уласна дзяцінства.

5.Асаблівасці выхавання і навучання, сацыялізацыі асобы ў падлеткавы перыяд.

6.Асаблівасці выхавання і навучання, сацыялізацыі асобы ў перыяд юнацтва

## Тэма 3. Пачатковая сацыялізацыя асобы ў народнай педагогіцы беларусаў.

Разглядаецца комплекс педагагічных намаганняў, накіраваных на забеспячэнне сацыякультурнай паспяховасці чалавека ад яго зачацця да прыняцця ў род. Вызначаецца паняцце і этапы пачатковай сацыялізацыі асобы. Праводзіцца разгляд асаблівасцей сацыялізацыі дзяцяці на кожным этапе.

**Пытанні**:

1.Пачатковая сацыялізацыя асобы: паняцце. Сацыялізацыя дзіцяці ў перадродавы перыяд.

2. Асаблівасці сацыялізацыі дзіцяці ў перыяд родаў.

3. Сацыялізацыя дзіцяці ў перыяд пасля нараджэння.

4. Месца радзіны і хрэсьбіну сістэме поглядаў народа аб сацыялізацыі асобы.

## Тэма 4. Сямейнае выхаванне і навучанне ў народна-педагагічнай культуры беларусаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Разглядаецца роля сям'і ў працэсе сацыялізацыі асобы. Як у цяперашнім посттрадыцыйным грамадстве, так і ў ранейшыя часы ў традыцыйным грамадстве, сям'я ёсць, па сутнасці, аснова сацыялізацыі асобы.

**Пытанні**:

1.Крытэрыі сям'і як фактару выхавання і навучання ў народнай педагогіцы беларусаў.

2.Тыпы і структура традыцыйнай сям'і беларусаў.

3.Асноўныя функцыі сям'і ў традыцыйным грамадстве.

4.Прынцыпы і традыцыі сямейнага выхавання і навучання беларусаў.

## Тэма 5. Праца як сродак выхавання і навучання ў этнапедагогіцы беларусаў

У ходзе вывучэння тэмы разглядаецца праца як гаспадарча-эканамічная і духоўна-этычная катэгорыя ў традыцыйным соцыуме, вывучаюцца віды працы і іх педагагічны змест.

**Пытанні**:

1.Праца як гаспадарча-эканамічная і духоўна-этычная катэгорыя ў традыцыйным соцыуме.

2.Віды працы і іх педагагічны змест у традыцыйным соцыуме.

3.Асноўныя прынцыпы працоўнага выхавання і навучання ў народнай педагогіцы беларусаў.

4.Гендэрнае раздзяленне працоўнага выхавання і навучання ў народнай педагогіцы беларусаў.

5.Узроставая паступовасць авалодвання працоўнымі навыкамі.

6.Віды промыслаў і рамёстваў, распаўсюджаныя на Беларусі. Формы навучання промыслам і рамёствам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 6. Соцыум як фактар навучання і выхавання ў традыцыйным і сучасным грамадстве

Паняцце “грамадская традыцыя”, роля і месца грамадскай традыцыі ў традыцыйным грамадстве, асноўныя прынцыпы функцыянавання традыцыйнай сельскай грамады беларусаў і іх педагагічны змест.

**Пытанні**:

1.Грамадскія традыцыі, іх роля і месца ў традыцыйным грамадстве.

2.Асноўныя прынцыпы функцыянавання традыцыйнай сельскай грамады беларусаў і іх педагагічны змест.

3.Народныя формы ўзаемадапамогі і дабрачыннасці і іх этнапедагагічны патэнцыял.

## Тэма 7. Асноўныя каштоўнасныя арыенціры грамадскага выхавання ў народна- педагагічнай культуры беларусаў

Сямейныя каштоўнасці як сродак выхавання – асаблівасці заключэння шлюбу, функцыянавання сям’і, сямейна-маёмасных адносін. Рэлігійнасць і народная мараль як сродак фарміравання асобы – асаблівасці рэлігійнага выхавання асобы. Рэлігійнае выхаванне як адзін з аспектаў народна-педагагічнай культуры беларусаў.

**Пытанні**:

1. Сямейныя каштоўнасці як сродак выхавання.

2. Роля царквы і касцёла ў паўсядзённым і святочным жыцці беларусаў, уплыў на грамадскія, сямейныя адносіны, на выхаванне дзяцей і моладзі.

3. Хрысціянская мараль і каштоўнасці як фактар народнай педагогікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 8. Фальклор як комплексны сродак усебаковага навучання івыхавання асобы

Фальклор – комплексны сродак шматбаковага выхавання гарманічнай асобы. Жанры традыцыйнага фальклору .

**Пытанні**:

1.Узроставая стратыфікацыя і педагагічны патэнцыял народнай казкі.

2. Дзіцячы фальклор у сістэме этнапедагогікі: узроставая стратыфікацыя, педагагічны патэнцыял розных жанраў.

3. Выхаваўчы патэнцыял народных прыкмет і павер’яў.

4. Выхаваўчыя і навучальныя магчымасці народных загадак, выслоўяў, прыкмет і павер’яў, былічак, вусных апавяданняў і жартаў.

5. Народны тэатр і яго месца ў сістэме этнапедагогікі беларусаў.

## Тэма 9. Асаблівасці этнапедагагічнай камунікацыі ў поліэтнічным адукацыйным асяроддзі Беларусі

Акрэсліваюцца асаблівасці выкарыстання народнага педагагічнага інструментарыю ў сучасным поліэтнічным адукацыйным асяроддзі. Разглядаецца этнапедагогіка розных нацыянальных і саслоўна-класавых груп насельніцтва Беларусі.

**Пытанні**:

1.Гараджане, іх побыт і педагагічная культура ў гістарычнай рэтраспектыве.

2.Педагагічная культура беларускай шляхты ў гістарычнай рэтраспектыве.

3. Асаблівасці культуры выхавання і навучання татар Беларусі.

4. Асаблівасці культуры выхавання і навучання яўрэяў Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. Асаблівасці культуры выхавання і навучання цыганскага насельніцтва Беларусі.

6.Асаблівасці культуры выхавання і навучання вялікарусаў-стараабрадцаў.

**Тэма 10. Культура этнапедагагічнай дзейнасці на сучасным этапе развіцця беларускага грамадства**

Праводзіцца параўнальны аналіз педагагічнага працэсу ў традыцыйным і посттрадыцыйным грамадствах, акрэсліваюцца шляхі выкарыстання станоўчага вопыту народнай педагогікі ў сучасным педагагічным працэсе. Акрэсліваюцца асаблівасці вырашэння педагагічных і выхаваўчых задач з улікам поліэтнічнага складу сучаснага грамадства.

**Пытанні**:

1.Параўнальны аналіз педагагічнага працэсу ў традыцыйным і посттрадыцыйным грамадствах.

2.Шляхі выкарыстання станоўчага вопыту народнай педагогікі ў сучасным педагагічным працэсе.

3.Маральна-этычнае, эстэтычнае, экалагічнае і фізічнае выхаванне асобы ў сістэме этнапедагогікі

4.Традыцыйная сістэма фізічнага выхавання беларускіх дзяцей.

5. Полікультурная кампетэнтнасць сучаснага педагога.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**КІРУЕМАЯ САМАСТОЙНАЯ РАБОТА**

**Тэма: Праблемы дзяцінства, узроставыя і індывідуальныя асаблівасці сацыялізацыі асобы ў народнай педагогіцы**

Падрыхтаваць рэфераты (пажадана акцэнтаваць лакальна-рэгіянальны аспект):

1.Асаблівасці сацыялізацыі асобы ў раннім маленстве.

2.Выхаванне і навучанне асобы ў перыяд маленства.

3.Асаблівасці сацыялізацыі асобы ў перыяд уласна дзяцінства.

4.Выхаванне і навучанне асобы ў падлеткавы перыяд.

5.Асаблівасці выхавання асобы ў перыяд юнацтва.

**Тэма**: **Праца як сродак выхавання і навучання ў этнапедагогіцы народаў Беларусі.**

Падрыхтаваць паведамленні:

1.Асноўныя прынцыпы працоўнага выхавання і навучання ў педагагічнай практыцы народаў Беларусі;

4.Гендэрнае раздзяленне працоўнага выхавання і навучання;

5.Асаблівасці асноўных промыслаў і рамёстваў, распаўсюджаных на Беларусі (гутніцтва, рымарства, ганчарства, пчалярства, рыбалоўства, лесахімічныя промыслы, народная медыцына, жабрацтва і г.д.)

6.Асаблівасці навучання рамёствам у гарадскім асяроддзі.

**Тэма: Асаблівасці этнапедагагічнай камунікацыі ў поліэтнічным адукацыйным асяроддзі Беларусі**

Падрыхтаваць даклады і прэзентацыі:

1.Этнічныя стрэрэатыпы і шляхі іх пазбаўлення;

2.Маральна-этычнае і эстэтычнае выхаванне асобы ў этна-рэлігійным кантэксце;

3.Экалагічнае і фізічнае выхаванне асобы ў этна-рэлігійным кантэксце;

4.Шляхі фарміравання полікультурнай кампетэнтнасці сучаснага педагога (эсэ-разважанне).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ФОРМА КАНТРОЛЮ

Форма кантролю — залік.

## СРОДКІ ДЫЯГНОСТЫКІ ВЫНІКАЎ НАВУЧАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Для выяўлення ўзроўня вынікаў навучання студэнтаў могуць выкарыстоўвацца:

1. Адказы на пытанні падчас практычных заняткаў;
2. Дыскусіі па праблемных пытаннях;
3. Выступленне з дакладамі, рэфератамі, паведамленнямі, эсэ на практычных занятках на абраныя тэмы;
4. Падрыхтоўка мультымедыйных прэзентацый;
5. Эўрыстычная размова;
6. Праблемная лекцыя.

## РЭЙТЫНГАВАЯ СІСТЭМА

| | **балы** | **колькасць** | **усяго** |
|---|---|---|---|
| **наведванне** | | | |
| Лекцыі | **2** | **2** | **4** |
| практычныя | **2** | **12** | **18** |
| **актыўнасць** | | | |
| адказ на практычных занятках | **4** | **5** | **20** |
| Рэферат | **8** | **1** | **8** |
| Даклад | **20** | **1** | **20** |
| паведамленне | **10** | **1** | **10** |
| Эсэ | **30** | **1** | **30** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| | 110 |

## КАРОТКІ СЛОЎНІК АСНОЎНЫХ ТЭРМІНАЎ

**Адопцыя** -- прыём у геральдычны род прадстаўнікоў іншых саслоўяў і наданне ім права на карыстанне гербам і дэвізам або ўсынаўленне шляхціцам няшляхціца, які мог захаваць сваё прозвішча.

**Анекдот** — невялікае апавяданне пра незвычайную смешную падзею, сітуацыю, рысу характару чалавека ці ўчынак, якое мае дасціпную неспадзяваную камічную развязку.

**Бацькоўская сям'я --** вялікая сям'я, у якой сумесна пражывалі і вялі агульную гаспадарку бацькі і іх жанатыя сыны.

**Блазн –** назва дзіцяці ў перыяд уласна дзяцінства (ад 6-8 да12-14 гадоў).

**Бонда** – звычай частаваць сваякоў, блізкіх суседзяў садавіной, гароднінай, хлебам, свежанінай, кулінарнымі вырабамі і інш. з нагоды збору новага ўраджаю, удалай рыбалкі, палявання, збору мёду.

**Брацкаясям'я –** вялікая сям'я, у якой сумесна пражывалі і вялі агульную гаспадарку два ці больш жанатых братоў.

**Былічка, бывальшчына** — вусны расказ-успаміны аб сустрэчах са звышнатуральнай сілай (як правіла, варожай).

**Вірылакальны шлюб** – від шлюбу, калі жанчына ішла жыць у сям'ю мужа.

**Вусныя бытавыя расказы –** вусны расказ, у якім апавядаецца пра падзеі з грамадскага ці асабістага жыцця з сучаснасці або мінулага, сведкам або ўдзельнікам якіх часта бывае сам расказчык.

**Грамадская традыцыя** – гэта сукупнасць сістэмных, устойлівых форм грамадскай дзейнасці, якія перадаюцца ад пакалення да пакалення

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(г.зн. па традыцыі) і ўтвараюць неабходную сувязь паміж пакаленнямі соцыума, звязваючы сацыяльнае жыццё этнасу ў адзінае цэлае.

**Дзетнасць** – наяўнасць у сям'і больш двух-трох дзяцей.

**Дзядзькаванне** – у асяроддзі беларускай шляхты звычай аддаваць дзяцей на пэўны тэрмін на выхаванне у сялянскую сям'ю з мэтай прывіць ім добрыя фізічныя і духоўныя якасці, уласцівыя простаму народу.

**Дзяцінства** -- ў народнай традыцыі гэта жыццёвы цыкл чалавека ад нараджэння да паўналецця (уступлення ў шлюб).

**Жанр** фальклора -- гэта група твораў, адзінства якой аб'ектыўна вызначаецца той вобласцю рэчаіснасці, на якую накіравана мастацкая свядомасць народа, падобным характарам праблематыкі, а таксама прызначэннем у жыцці народа.

**Жарт** — дасціпная насмешка, высмейвае бытавыя здарэнні, смешныя рысы і якасці людзей, іх дзіўныя ўчынкі і размовы.

**Загадка –** замыславатае пытанне, выказанае ў сціслай, вобразнай метафарычнай форме.

**Звычаёвые права** – вусныя прадпісанні традыцыйнага соцыума, якія перадаюцца ад пакалення да пакалення і арганізуюць, рэгулююць жыццё соцыума.

**Індыгенат** -- прызнанне шляхецтва прадстаўнікоў прывілеяваных саслоўяў іншых краін.

**Кафігуратыўны тып выхаваўчай культуры** — культура, дзе і дзеці і дарослыя вучацца ў сваіх равеснікаў, у людзей аднаго з імі пакалення.

**Легенда—** вусны апавядальны твор, у аснове якога ляжаць звязаныя з гісторыяй народа фантастычныя або апаэтызаваныя вобразы, уяўленні, падзеі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Малая сям'я** –  сям'я, у якой сумесна пражывала і вяла агульную гаспадарку адна пара.

**Маленства** – узроставы перыяд ад 2-3 да 6-8 гадоў.

**Маленства ранняе** – узроставы перыяд ад нараджэння да 2-3 гадоў.

**Матрылакальны шлюб** – від шлюбу, калі мужчына ішоў жыць у сям'ю жонкі і цесця.

**Мацярынская школа** -- сукупнасць народна-педагагічных метадаў і прыёмаў выхавання і навучання дзяцей у перыяд ранняга маленства.

**Набілітацыя** -- наданне шляхецтва каралём, сеймам або гетманам на полі бою за выдатныя баявыя заслугі

**Нераздзеленыя (вялікая) сям'я** – сям'я, у якой сумесна пражывалі і вялі агульную гаспадарку некалькі шлюбных пар.

**Нуклеарная малая сям'я** – сям'я, у склад якой уваходзіць шлюбная пара з дзецьмі або без іх.

**Няпоўная малая сям'я** – сям'я, у склад якой могуць уваходзіць: удава з дзецьмі ці без іх; мужчыны і жанчыны з дзецьмі пасля скасавання шлюбу; маці і пазашлюбнае дзіця.

**Павер'е** – гэта ўяўленне, заснаванае на веры ў існаванна містычных сувязей паміж з'явамі навакольнага свету і лёсам чалавека.

**Паданне** — вуснае апавяданне пра рэальных асоб, сапраўдныя падзеі, пра населеныя пункты, мясцовасці і г. д.

**Падлеткавы перыяд** – узроставы перыяд ад 12—14 да 16-17 гадоў.

**Пастухоўскі перыяд** --  узроставы перыяд ад 6-8 да 12-14 гадоў (перыяд "уласна дзяцінства").

**Перыяд дапаможных работ** – узроставы перыяд ад 6-8 да 12-14 гадоў (перыяд "уласна дзяцінства").

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Постфігуратыўны тып выхаваўчай культуры** — культура, калі дзеці вучацца ў сваіх папярэднікаў, у старэйшых пакаленняў.

**Праца-клопат** – праца, якая ажыццяўляецца як водгук на патрэбу (чалавечую, гаспадарчую).

**Праца-поспех** – праца, якая выконваецца не па патрэбе, не па здольнасцях, а па наяўнасці ўхвалення.

**Праца-работа** – праца, якая ажыццяўляецца за грошы, за узнагароджанне.

**Промысел –** усялякая неземляробчая і нежывёлагадоўчая дзейнасць, што служыць падсобнай крыніцай даходу.

**Прочкі –** часовы развод сямейнай пары.

**Прыкмета** – гэта прадказанне пэўнага выніку, заснаванне на аб’ектыўнай прычынна-выніковай залежнасці з’яў, падзей, дзеянняў і пацверджанае шматвяковым народным вопытам.

**Прымацтва --** від шлюбу, калі мужчына ішоў жыць у сям’ю жонкі і цесця

**Прэфігуратыўны тып выхаваўчай культуры** — культура, дзе дарослыя вучацца ў сваіх дзяцей.

**Радзіны --** своеасаблівае жаночае пасляродавае свята, падчас якога дзіця ўскосна (праз пасрэдніцтва маці) далучалася таксама да роду.

**Разлучыны** – канчатковы развод сямейнай пары.

**Рамяство** – першая гістарычная стадыя апрацоўваючай вытворчасці, якая папярэднічае сучаснай машыннай вытворчасці.

**Сацыялізацыі магічна-рытуальная** -- комплекс пэўных магічных абрадаў і дзеянняў, у выніку якіх чалавек далучаецца да сацыяльнай супольнасці сям’і, вясковай грамады, традыцыйнага соцыума.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Сацыялізацыя асобы** — працэс засваення асобай сацыяльных роляў і сацыякультурных норм, далучэнне яе да жыццёвых каштоўнасцей сям'і, роду, вясковай супольнасці.

**Сацыялізацыя міфалагічна-рытуальная** -- комплекс пэўных абрадаў і дзеянняў, намаганняў, накіраваных на забеспячэнне сацыякультурнай паспяховасці чалавека, якія маюць пераважна міфалагічную матывацыю.

**Сацыялізацыя пачатковая** -- комплекс педагагічных намаганняў, накіраваных на забеспячэнне сацыякультурнай паспяховасці чалавека ад яго зачацця да прыняцця ў род.

**Сацыялізацыя сакральна-рытуальная**– комплекс рытуалаў, дзеянняў, накіраваных на забеспячэнне сацыякультурнай паспяховасці асобы, якія выражаюць стыхійныя народныя веды, або якім надаваўся нейкі сакральны сэнс.

**Сацыяльная кампетэнцыя** (ад лац. *Competentia*)— кола пытанняў, у якіх даная асоба валодае ведамі, вопытам.

**Складаная малая сям'я** – сям'я, у склад якой уваходзіць шлюбная пара з дзецьмі а таксама любы іншы родзіч з боку мужа або жонкі.

**Стараабрадцы (стараверы)** – этнаканфесійнага група рускага насельніцтва, якая з'явіліся ў Беларусі ў другой палове 17 ст. пасля ніканаўскай рэформы рускай праваслаўнай царквы.

**Сябрына**– звычай сумеснага карыстання той ці іншай уласнасцю: сенажаццю, пашай, рабочай жывёлай, пчоламі.

**Тайны шлюб** – від шлюбу без папярэдняй згоды бацькоў маладых.

**Талака**-- звычай сумеснай дабрачыннай працы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Талака бязвыплатная --** дапамога грамады асобнаму яе члену, або сям'і, якія патрапілі ў складаныя жыццёвыя абставіны: пажар, хвароба ці смерць кармільца, сіроцтва і да т.п.

**Талака каляндарная** – талака, што збіралася на працягу каляндарнага года для выканання найбольш працаёмкіх сельскагаспадарчых работ.

**Уласна дзяцінства** – узроставы перыяд ад 6-8 да 12-14 гадоў.

**Фальклор** – адзін з відаў народнага мастацтва, які адлюстроўвае рэчаіснасць у вобразах, створаных пры дапамозе паэтычнага слова.

**Фальклор дзіцячы** – творчасць дарослых для дзяцей і саміх дзяцей.

**Хрэсьбіны –** магічна-рытуальнае дзейства ўключэння, прыёму нованароджанага ў жыццё грамады, соцыума.

**Цэх**– асобная прафесійная арганізацыях гарадскіх рамеснікаў.

**Школа пеставання** -- сукупнасць народна-педагагічных метадаў і прыёмаў выхавання і навучання дзяцей у перыяд ранняга маленства.

**Шлюб "на сумленне" ("напавер")** – від шлюбу без афіцыйнага афармлення адносін, грамадзянскі шлюб.

**Шляхта** – прывілеяванае саслоўе ў Польшчы, Чэхіі, Літве, Беларусі, Украіне ў 13 – пач. 20 ст.

**Этнапедагогіка** -- 1) педагагічная сістэма (г.зн. сістэму выхавання і навучання) таго ці іншага народа (беларусаў, рускіх, палякаў, яўрэяў і г.д.); 2) сістэма прынятых на пэўнай тэрыторыі / у пэўным рэгіёне ці мясцовасці прынцыпаў, сродкаў і метадаў выхавання і навучання, перадачы жыццёвага вопыту; 3) навука, якая вывучае педагагічныя веды і вопыт выхавання і навучання канкрэтнага народа.

**Этнас –** устойлівая супольнасць людзей, якая гістарычна склалася на пэўнай тэрыторыі і характарызуецца агульнасцю мовы, культуры, побыту, рысаў псіхікі і самасвядомасці, адлюстраванай у адзінай назве і ўяўленнях пра агульнасць паходжання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Этнічная культура --** спецыфічны лад жыцця, а таксама сукупнасць норм і каштоўнасцей, ўласцівых таму ці іншаму этнасу.

**Юнацтва** -- узроставы перыяд ад 16-17 да 19-21 года.

## АСНОЎНАЯ ЛІТАРАТУРА


1. Андрэева Е.Г. Гісторыя педагогікі. Ч. ІІ. Гісторыя педагогікі Беларусі са старажытных часоў да 1917 года. Вучэбны дапаможнік. Мн., 1993.– 244 с.
2. Андрэева Е.Г. Гісторыя народнай адукацыі Беларусі (1917 – 1941 гг.). Мн., 2001. – 319 с.
3. Арлова, Г.П. Народная педагогіка ў выхаваўчай рабоце школы. Мн., 1995. – 157 с.
4. Арлова, Г.П. Народная педагогіка: вучэбна-метадычны дапаможнік. Віцебск, 2006. – 168 с.
5. Барташэвіч Г.А. Фальклор у сістэме выхавання // Праблемы выхавання. – 1995. – №1. – С. 70–75.
6. Волков, Г.Н. Этнопедагогика. М., 1999. – 376 с.
7. Воронецкая, Л.Н., Мелешко, Ю.В. Народная педагогика. – Мн., 2007. – 176 с.
8. Грымаць, А.А., Варанецкая, Л.М. Беларуская народная педагогіка ў школе. Мн., 1996. – 173 с.
9. Грымаць, А.А., Варанецкая, Л.М. Беларуская народная педагогіка: тэорыя і практыка. Мн., 1996. – 190 с.
10. Грымаць, А.А., Варанецкая, Л.М. Народная педагогіка беларусаў. Мн., 1999. – 255 с.
11. Гуд П.А. Народныя традыцыі ў сучасных беларускіх святах // Пазашкольнае выхаванне. – 2000. – № 2. – С. 23–26.
12. Жлоба, С.П. Народная педагогика Полесья. Брест, 2002. – 324 с.
13. Калачова, І.І. Народныя традыцыі і звычаі выхавання. Этнапедагагічная спадчына этнасаў Беларусі. Мн.,1999. – 176 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

14.Катович Н.К. Воспитание средствами природы в народной педагогике белорусов // Пазашкольнае выхаванне. – 2002. – № 1. – С. 13–15.

15.Кукушин, В.С. Этнопедагогика. Учебное пособие. М., 2002. – 218 с.

16.Снапкоўская, С.В. Гісторыя адукацыі і педагагічнай думкі Беларусі (60-я гады XIX ст.– пач. XX ст.). Мн.,2001.-160 с.

17.Сучкоў І.І. Фальклорны тэатр і выхаванне асобы. Мн.:НІА, 2001. – 176 с.

## ДАДАТКОВАЯ ЛІТАРАТУРА

1. Аляхновіч, А.М., Лозка, А.Ю. Веснавыя святы: Дапаможнік для настаўнікаў і выхавальнікаў. Мн., 2000. – 156 с.
2. Беларускі музычны фальклор/ Склад.А.М. Аляхновіч і інш.. Мн., 1996. – 334 с.
3. Беларуская вусна-паэтычная творчасць. Гісторыка-тэарытычнае даследванне. Мн., 1988. – 415 с.
4. Беларускі дзіцячы фальклор (традыцыйныя запісы, апрацоўкі і аўтарскія творы) / Склад. А.М. Аляхновіч і інш. Мн., 1994. – 270 с.
5. Беларускі фальклор: Энцыклапедыя. У 2-х т. Т. 1. Мн., 2005. – 756 с.; Т. 2. Мн., 2006. – 828 с.
6. Беларусы. Т.5. Сям’я / Склад. М.Ф. Піліпенка, В.К. Бандарчык і інш. Мн., 2001.– 375 с.
7. Беларусы. Т.6. Грамадскія традыцыі / Склад. М.Ф. Піліпенка, В.К. Бандарчык і інш. Мн., 2002. – 606 с.
8. Беларусы. Т.7. Вусная паэтычная творчасць / Склад. М.Ф. Піліпенка, В.К. Бандарчык і інш. Мн., 2004. – 586 с.
9. Бершадский, С.А. Литовские евреи. – СПб, 1883. – 431 с.
10. Герман, А.В. Библиография о цыганах: Указатель книг и статей с 1780 по 1930 гг. – М., 1930. – 141 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

11.Герман, А.В. Цыгане вчера и сегодня. М., 1931. – 100 с.
12.Грамадскі быт і культура гарадского насельніцтва Беларусі / Склад. В.К. Бандарчык і інш.. Мн., 1990. – 248 с.
13. Грамадскі быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі / Склад. В.К. Бандарчык і інш. Мн., 1993. – 253 с.
14. Гульні, забавы, ігрышчы / Гал. рэд. А.С. Фядосік. Мн., 1996. – 532 с.
15. Гурскі, А.І. Бяздоннае багацце. Легенды,паданні. Мн., 1990. – 255 с.
16. Дубянецкі, Э.С. Таямніцы народнай душы. Мн., 1995. – 47 с.
17. Дубянецкі, Э.С., Дубянецкі, С.Ф. Перашкоды на шляху нацыянальна-культурнага адраджэння Беларусі. Мн., 1992. – 26 с.
18.Думін, С.У., Канапацкі, І.Б. Беларускія татары: мінулае і сучаснасць. – Мн., 1993. – 202 с.
19.Евреи: По страницам истории / Сост. С.Асиновский, Э.Иоффе. Мн., 1997. – 313 с.
20.Еврейская летопись. М., 1923. – 64 с.
21.Канапацкі, І.Б., Смолік, А.І. Гісторыя і культура беларускіх татар. – Мн., 2000. – 258 с.
22. Канаш, В.П. Выхаваўчая работа ў школе на аснове каляндарнай абраднасці беларусаў. Мн., 1995. – 56 с.
23. Конан, У. Ля вытокаў самапазнання: Станаўленне духоўных каштоўнасцей у святле фальклору. Мн.,1989. –238 с.
24. Крук, І.І. Следам за сонцам: Беларускі народны каляндар. Мн., 1998. – 214 с.
25. Кухаронак, Т.І. Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў. Мн., 2001.– 239 с.
26. Кухаронак, Т.І. Радзінныя звычаі і абрады беларусаў: канец XIX – XX ст. Мн., 1993. – 124 с.
27. Ластоўскі, В.Ю. Кароткая гісторыя Беларусі. Мн., 1993. – 126 с.
28. Ліцьвінка, В.Дз. Святы і абрады беларусаў. Мн., 2001. – 188 с.
29. Мікуліч, Т.М. Мова і этнічная самасвядомасць. Мн.,1996. – 157 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

30. Навагродскі, Т.А. Традыцыі народнага харчавання беларусаў. Мн., 2000. – 111 с.
31. Народная культура і сучасная школа / Пад рэд. І.І. Крука. Мн., 1996. – 104 с.
32. Ракава, Л.В. Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы. Мн., 2000. – 111 с.
33. Родины, дети, повитухи в традициях народной культуры / Сост. Е.А. Белоусова; Отв. ред. С.Ю. Неклюдов. – М.: Российский государственный гуманитарный университет, 2001. – 319 с.
34. Русские дети: Основы народной педагогики. Иллюстрированная энциклопедия / Авт.: Д.А. Баранов, О.Г. Баранова, Т.А. Зимина и др. – СПб.: Искусство, 2006. – 566 с.
35. Салееў, В.А. Этнапедагогіка і эстэтычнае развіццё асобы. Мн., 1994. – 181 с.
36. Сахута, Я.М. Народнае мастацтва Беларусі. Мн., 1997.– 286 с.
37. Скорабагатчанка, А. Беларускія народныя музычныя інструменты XX ст. Мн., 2001. – 397 с.
38. Словарь социального педагога и социального работника. Мн., 2001.– 252 с.
39. Сысоў, У.М. З крыніц спрадвечных. Мн., 1997. – 415 с.
40. Сям'я і сямейны быт беларусаў / Пад. рэд. В.К. БандарчыкаМн., 1990. – 253 с.
41. Цітоў, В.С. Этнаграфічная спадчына. Беларусь. Краіна і людзі: Вучэбн.метад.дапаможнік. Мн., 2001. – 207 с.
42. Чэчат, В.У. Педагогіка сямейнага выхавання (тэарэтыка-метадалагічны аспект). Мн., 1995. – 195 с.
43. Шантыр, Ф. Патрэбнасць нацыянальнага жыцця для беларусаў і самаадзначэння народу. Мн., 1992. – 21 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ